# ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена

1 СНЕЖНЯ 2022 г.
ЧАЦВЕР
№ 20 (15943)

Выдаецца з 21 красавіка 1921 года


*Маладыя імёны*

## Ксенія ГАЛЕЦКАЯ:
# «Галава ад поспеху не кружыцца»



**Яна належыць да ліку юных артыстаў прадзюсарскага цэнтра «СПАМАШ», але па сваіх вакальных і артыстычных здольнасцях не саступае многім прафесіяналам. З дзяцінства Ксенія, дзякуючы бацькам, мела магчымасць шукаць сябе: займалася фігурным катаннем, танцамі, вакалам. І калі спынілася на апошнім, то знайшла занятак па душы. Так пачаліся конкурсы, выступленні на вялікіх сцэнах, першае прызнанне і нават прадзюсарскі кантракт. Але і сёння дзяўчына пераканана, што галоўнае ў любой справе — каб гарэлі вочы і сэрца ад таго, чым займаешся. А пра тое, як складваецца яе творчая гісторыя, што цікавіць акрамя эстрады і чым вымяраецца папулярнасць, Ксенія Галецкая расказала пры сустрэчы.**

***— Ты займаешся музыкай з шасці гадоў, а калі зразумела, што гэта твая стыхія?***

— Спачатку, калі мама прывяляла мяне на заняткі па вакале, я проста ўспрымала іх з цікавасцю, але без асаблівага энтузіязму. Не думала, што буду спяваць прафесійна. А потым, калі пачала ўдзельнічаць у розных конкурсах, перамагаць, то з'явіўся азарт. Так паступова і звязала свой лёс з музыкай.

***— Якая з тваіх перамог найбольш для цябе дарагая?***

— Адну мне складана выдзеліць, але да яркіх дасягненняў адношу сваю перамогу на дзіцячым «Славянскім базары», таму што той конкурс падзяліў маё жыццё на «да» і «пасля». З'явілася шмат канцэртаў, здымак, цікавых сустрэч. Само па сабе спаборніцтва вельмі прэстыжнае. Не менш дарагая для мяне таксама і перамога на конкурсе «SanRemo Junior», да ўдзелу ў якім мы з прадзюсарскім цэнтрам «СПАМАШ» рыхтаваліся вельмі настойліва. Было разуменне, што трэба выступіць лепш за ўсіх. Рада, што ў нас усё атрымалася.

***— Як ты трапіла ў «СПАМАШ»?***

— Гэта адбылося пасля таго, як мы з бацькамі пераехалі з Гомеля ў Мінск у 2019 годзе. Спачатку я займалася ў дзіцячай студыі «Malinovka by Spamash». Спявала ў трыа «Маліна». А калі ўжо пайшла на нацыянальны адбор дзіцячага конкурсу «Віцебск-2019» і потым даведалася, што буду прадстаўляць Беларусь, то, можна лічыць, распачала ўжо сольную кар'еру ў прадзюсарскім цэнтры.

***(Заканчэнне на 4-й стар. «ЧЗ».)***

*Агульны інтарэс*

# УБАЧЫЦЬ СВАЕ МАГЧЫМАСЦІ

## Для самарэалізацыі моладзі ствараецца адпаведная атмасфера

**Праекты «Жывая гісторыя», «Навука на пальцах», «Антынавуковая канферэнцыя», грамадзянска-патрыятычны марафон «Разам — за моцную і квітнеючую Беларусь», Рэспубліканскі інтэлектуальна-спартыўны турнір «Беларусь: Адзінства. Незалежнасць. Будучыня», Беларускі студэнцкі патрыятычны форум... Спіс ініцыятыў, якія прапанавалі студэнты беларускіх ВНУ, можна працягваць доўга. І гэта найлепшы адказ на пытанне: а якая яна, сучасная моладзь? Не адстаюць ад студэнтаў па сваёй актыўнасці і маладыя даследчыкі з Нацыянальнай акадэміі навук. Асноўным рухавіком маладзёжнай палітыкі тут выступае Савет маладых вучоных. У яго складзе — практычна кожны чацвёрты навуковы работнік акадэміі.**



Фота Лізаветы ГОЛАД.

**Праект «100 ідэй для Беларусі» — адзін з самых дзейсных інструментаў па выяўленні таленавітай моладзі.**

## НАВУКА — ГЭТА ЗАХАПЛЯЛЬНА...

Як расказаў **старшыня Савета маладых вучоных дырэктар Цэнтральнай навуковай бібліятэкі імя Якуба Коласа НАН Беларусі Станіслаў ЮРЭЦКІ**, у маі бягучага года ў сценах акадэміі адбыўся ўжо трэці рэспубліканскі форум навуковай моладзі «Шлях у навуку».

***(Заканчэнне на 2-й стар. «ЧЗ».)***

*Знайсці сябе*

# «НАЗАД ДАРОГІ ЎЖО НЕ БУДЗЕ»

## Якім бывае шлях да псіхалогіі

**Больш за ўсё натхняюць людзі, улюбёныя ў сваю справу. У іх літаральна гараць вочы ад зацікаўленасці і новых адкрыццяў. Хтосьці злуецца, называе такіх выскачкамі і працаголікамі, а нехта сам запальваецца ад іх і спяшаецца таксама знайсці сябе. Прыкладам адданага сваёй справе чалавека з'яўляецца Аляксандра ЖАЛЯЗНЯК-ЧОРНАЯ, псіхолаг Гродзенскага абласнога клінічнага цэнтра «Псіхіятрыя-наркалогія».**



У школьныя гады ў дзяўчыны было шырокае кола інтарэсаў, аднак псіхалогія заўжды ішла лейтматывам. Аляксандра актыўна чытала навукова-папулярныя кнігі па гэтай тэме, вывучала людзей. Самым вялікім адкрыццём для дзяўчыны-падлетка была думка: «Нішто сабе: пра гэта ўжо пісалі, а я думала, што праходжу шлях, які ніхто не разумее».

Зараз Аляксандра ўжо зусім не падлетак. Яна скончыла ГрГУ імя Янкі Купалы па спецыяльнасці «Сацыяльная псіхалогія» і магістратуру там жа. На пытанне, чаму не спынілася на бакалаўрыяце, дзяўчына адказвае наступнае:

— Па-першае, магістратура ў маім універсітэце вельмі практыкаарыентаваная. Пасля бакалаўрыяту ў мяне была добрая тэарэтычная база, але практыкі хацелася б больш. Па-другое, я мару выкладаць. А магістратура — адна з прыступак да гэтага. І, па-трэцяе, пасля выпуску не хацелася развітвацца з факультэтам. За чатыры гады нібыта «не насыцілася» ім да канца.

Аляксандра ў асноўным займаецца псіхадыягнастычнай дзейнасцю.

— Наша задача — вызначыць асаблівасці мыслення, увагі і памяці ў пацыента, — распавядае дзяўчына.

Таксама Аляксандра адкрыла ІП для таго, каб мець магчымасць праводзіць індывідуальныя і групавыя кансультацыі. Творчую самарэалізацыю гераіня атрымлівае ад вядзення блога ў «Інстаграме». Там Аляксандра займаецца псіхалагічнай асветай і атрымлівае ў якасці зваротнай сувязі масу станоўчых водгукаў.

***(Заканчэнне на 3-й стар. «ЧЗ».)***